Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт мастацкай культуры
Кафедра рэжысуры

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
Петухова Н.В.
17 сакавіка 2026 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
Пагоцкая А.В.
17 сакавіка 2026 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

«ДРАМАТУРГІЯ НАРОДНЫХ АБРАДАЎ І СВЯТ»

для спецыяльнасці 6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят

Складальнік: Шык К. І., старшы выкладчык кафедры рэжысуры, кандыдат педагагічных навук

Разгледжана і зацверджана на пасяджэнні Савета ўніверсітэта
(пратакол № 7 ад 17.03.2026 г.)

Рэцэнзенты:

*кафедра агульнай і прафесійнай педагогікі* ўстановы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі»;

*Д. В. Герасімёнак,* загадчык кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі.

Разгледжана і абмеркавана на паседжанні кафедры рэжысуры
(пратакол № __ ад ________2026)

**ЗМЕСТ**

1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА ........................................................................ 4
2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ....................................................................... 6
2.1 Канспекты лекцый па дысцыпліне .................................................... 6
3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ........................................................................ 12
3.1 Тэматыка практычных заняткаў ....................................................... 12
3.2 Пералік пытанняў па тэмах індывідуальных заняткаў ......................... 14
3.3 Самастойная работа студэнтаў…………………………………….....15
4. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ………………………………………...16
5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………………..…......19

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Драматургія народных абрадаў і свят» распрацаваны для спецыяльнасці 6-05-0215-04 «Рэжысура прадстаўленняў і свят», прадстаўляе сабой сістэму вучэбна-метадычных матэрыялаў, выкарыстанне якіх забяспечвае набыццё студэнтамі адпаведных ведаў і кампетэнцый па абазначаным напрамку.

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Драматургія народных абрадаў і свят» накіраваны на падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў, здольных да самастойнай творчай дзейнасці па сучасных стандартах у сферы культуры. Асновай навучання з’яўляецца індывідуальны падыход, які ўлічвае назапашаны вопыт, асабістыя якасці і творчы патэнцыял кожнага студэнта.

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Драматургія народных абрадаў і свят» цесна ўзаемазвязаны з іншымі прадметамі спецыяльнага цыкла – «рэжысура фальклорных прадстаўленняў», «тэорыя драмы», «асновы сцэнарнага майстэрства».

**Мэта ВМК** – фарміраванне ў студэнтаў неабходнага комплексу ведаў пра заканамернасці і асноўныя тэндэнцыі развіцця драматургіі народных абрадаў і свят.

**Задачы ВМК:**

– раскрыць ідэйна-мастацкія, філасофскія і культуралагічныя карані драматургіі народных абарадаў і свят;

– вызначыць месца драматургіі ў абрадах і святах;

– сістэматызаваць тэарэтычныя веды студэнтаў у галіне гісторыі і тэорыі драматургіі;

– вывучыць асноўныя напрамкі, школы драматургіі абрадаў і свят;

– раскрыць стылявыя асаблівасці рэжысёраў свят, якія аказалі ўплыў на развіццё айчыннай і сусветнай святочнай культуры.

Вучэбна-метадычны комплекс па вучэбнай дысцыпліне «Драматургія народных абрадаў і свят» накіраваны на фарміраванне базавай прафесійнай кампетэнцыі: умець выкарыстоўваць навукова-тэарэтычныя веды па драматургіі для рашэння творчых задач па ўвасабленні народных абрадаў і свят.

У выніку вывучэння ВМК студэнт павінен:

*ведаць*:

– гістарычныя перадумовы ўзнікнення драматургіі;

– класіфікацыю, вытокі народных абрадаў і свят;

– структурную кампазіцыю народных абрадаў і свят;

– асноўныя складнікі сцэнарна-драматургічнай асновы народных свят;

– этапы работы над стварэннем сцэнарыя абрадаў і свят.

*умець:*

– адбіраць фальклорны, мастацка-літаратурны, дакументальны матэрыял для стварэння пэўнага сцэнарыя народных абрадаў і свят;

– ствараць метадам кампіляцыі новы сцэнарый на аснове іншых сцэнарных распрацовак;

– пісаць сцэнарыі народных абрадаў і свят;

– карыстацца і адбіраць патрэбны паэтычны, музычны, мастацка-выяўленчы, відэаматэрыял па тэматыцы свята, абрада;

– ствараць па законах драматургіі народнае свята, абрад.

*валодаць:*

– ведамі пра беларускія народныя святы і абрады;

– методыкай распрацоўкі сцэнарыяў народных абрадаў і свят;

– уменнем працаваць з фальклорнымі, літаратурнымі, дакументальнымі крыніцамі пры стварэнні народнага свята, абрада.

– метадамі рэстаўрацыі, рэканструкцыі, трансфармацыі абрадаў і свят;

– навыкамі аналіза драматургічнай асновы народнага абрадавага свята.

Адукацыйны працэс па дадзеным вучэбна-метадычным комплексе накіраваны не толькі на набыццё студэнтамі тэарэтычных ведаў, практычных уменняў і навыкаў па прафесіі рэжысёр, але і на развіццё творчага патэнцыялу, каштоўнасна-сэнсавых арыентацый, духоўна-асобасных якасцяў, а таксама на фарміраванне светапогляднай пазіцыі, крэатыўнага мыслення, грамадзянска-патрыятычных якасцей асобы, гатовай да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Па структуры ВМК складаецца з:

– тлумачальнай запіскі;

– тэарэтычнага раздзела, прадстаўленага канспектам лекцый;

– практычнага раздзела, які раскрывае змест індывідуальных і практычных заняткаў, самастойнай работы;

– раздзела кантролю ведаў, які раскрывае формы атэстацыі, крытэрыі ацэнкі ведаў, пералік пытанняў да экзамена;

– дапаможнага раздзела, прадстаўленага спісам рэкамендаванай літаратуры (асноўнай і дадатковай), вучэбна-метадычнай картай вучэбнай дысцыпліны.

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ
## 2.1 Канспекты лекцый па дысцыпліне

ЛЕКЦЫЯ 1. УВОДЗІНЫ. ПРАДМЕТ І ЗАДАЧЫ КУРСА. РОЛЯ НАРОДНЫХ АБРАДАЎ І СВЯТ У ЖЫЦЦІ ДЗЯРЖАВЫ І ГРАМАДСТВА

1. *Прадмет вывучэння зместу дысцыпліны.*
2. *Мэта і задачы дысцыпліны.*
3. *Святы і іх прызначэнне ў грамадстве.*
4. *Значэнне народных абрадаў і свят.*

Вывучэнне дысцыпліны «Драматургія народных абрадаў і свят» накіравана на фарміраванне базавай прафесійнай кампетэнцыі: умець выкарыстоўваць навукова-тэарэтычныя веды па драматургіі для рашэння творчых задач па ўвасабленні народных абрадаў і свят.

*Мэта* дысцыпліны – фарміраванне ў студэнтаў неабходнага комплексу ведаў пра заканамернасці і асноўныя тэндэнцыі развіцця драматургіі народных абрадаў і свят.

*Задачы* дысцыпліны: раскрыць ідэйна-мастацкія, філасофскія і культуралагічныя карані драматургіі народных абарадаў і свят; вызначыць месца драматургіі ў абрадах і святах; сістэматызаваць тэарэтычныя веды студэнтаў у галіне гісторыі і тэорыі драматургіі; вывучыць асноўныя напрамкі, школы драматургіі абрадаў і свят; раскрыць стылявыя асаблівасці рэжысёраў свят, якія аказалі ўплыў на развіццё айчыннай і сусветнай святочнай культуры.

Народнае свята – гэта шматгранная сацыяльная з’ява, якая адлюстроўвае жыццё дзяржавы і грамадства, традыцыйны сродак рэалізацыі людзьмі вольнага часу, масавых камунікацый, што абумоўлівае групавую аснову святкавання, устанаўленне духоўных сувязей паміж яго ўдзельнікамі. Народныя святы і абрады фарміруюць асобу, уздзейнічаюць на яе маральна-эстэтычнае развіццё і сацыяльную актыўнасць. Іх функцыі ўзаемазвязаны і адлюстроўваюць гістарычныя, гаспадарчыя, матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці грамадства. Прымеркаваныя да пэўных этапаў дзейнасці, святы рэгулююць рытм працы і адпачынку. Менавіта тэматыка свята вызначае яго структуру – аснову будучага сцэнарыя.

Асноўныя структурныя элементы: сюжэт і дзеянне, персанажы і дыялогі, музыка, танцы, касцюмы, дэкарацыі, сімволіка. Аналіз гэтых складнікаў дае разуменне і алгарытм стварэння сцэнарыя свята.

Святы і абрады дапамагаюць узбагаціць веды па айчыннай гісторыі і культуры, больш даведацца пра асновы беларускай дзяржаўнасці, па-іншаму паглядзець на з’явы культуры. Галоўныя наватворы – рэфлексіўнае мысленне, пачуццё далучанасці да гісторыі і каштоўнасцей краіны, адказнасць за яе будучыню і матывацыя да стваральнай дзейнасці на карысць дзяржавы і грамадства.

# ЛЕКЦЫЯ 2. КЛАСІФІКАЦЫЯ НАРОДНЫХ СВЯТ І ІХ ХАРАКТЭРНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

1. *Прынцыпы класіфікацыі і сістэматызацыі народных свят.*
2. *Тыпы народных свят.*
3. *Агульныя характэрныя асаблівасці народных свят.*
4. *Выхаваўчы патэнцыял народнага свята.*

Разуменне прынцыпаў класіфікацыі і сістэматызацыі народных свят дазваляе глыбей асэнсаваць іх значэнне і ролю ў жыцці грамадства, а таксама выявіць іх неацэнны выхаваўчы патэнцыял.

Класіфікацыя народных свят грунтуецца на розных крытэрыях, якія дазваляюць вылучыць іх асноўныя тыпы і прасачыць іх сувязі. Гэтыя прынцыпы адлюстроўваюць шматграннасць і шматслаёвасць народнай культуры, дзе пераплятаюцца дахрысціянскія вераванні, аграрныя практыкі і хрысціянскія традыцыі.

Найбольш распаўсюджанымі прынцыпамі з’яўляюцца:

- *каляндарны прынцып*. Гэта аснова большасці народных свят. Святы прывязваюцца да пэўных дат і перыядаў года, адлюстроўваючы натуральныя цыклы прыроды (Каляды, Масленіца, Купалле). Гэты прынцып падкрэслівае глыбокую сувязь чалавека з прыродай і яго залежнасць ад яе рытмаў.
- *аграрны прынцып*. Цесна звязаны з каляндарным, але акцэнтуе ўвагу на земляробчай гаспадарцы. Святы звязаны з абрадамі, накіраванымі на ўраджай, урадлівасць зямлі, дабрабыт і абарону ад нягод (Зажынкі, Дажынкі, Багач). Гэта адлюстроўвае асноўны занятак большасці насельніцтва ў мінулым і яго імкненне забяспечыць выжыванне.
- *рэлігійны прынцып*. Пасля прыняцця хрысціянства многія дахрысціянскія святы былі адаптаваны або заменены хрысціянскімі. Святы адлюстроўваюць хрысціянскія традыцыі, біблейскія падзеі і жыццё святых (Нараджэнне Хрыстова, Пасха, Пакровы). Часта адбываецца сінкрэтызм, калі язычніцкія элементы пераплятаюцца з хрысціянскімі (Іван Купала).
- *сацыяльны прынцып*. Святы звязаны з сямейнымі падзеямі (Радзіны, Хрэсьбіны, Вяселле), родавымі адносінамі, а таксама з жыццём грамадства ў цэлым (Кірмаш, Провады ў войска). Гэты прынцып падкрэслівае ролю свята як інструмента сацыялізацыі і ўмацавання грамадскіх сувязей.

На аснове гэтых прынцыпаў можна вылучыць наступныя тыпы народных свят: зімовыя, вясновыя, летнія, асеннія, якія ўтвараюць цэласную сістэму, адлюстроўваючы гадавы цыкл жыцця чалавека і прыроды.

Народныя святы – гэта не проста адпачынак ці забава, а складаная сістэма культурных, сацыяльных і духоўных праяў, якая адлюстроўвае светапогляд, актуалізуе традыцыйныя каштоўнасці народа, тым самым яднаючы яго ўдзельнікаў, злучае духоўнымі ніцямі пакаленні, падтрымліваючы адзінства грамадства, з’яўляецца жывым сведчаннем гісторыі, калектыўнай памяці і творчасці.

# ЛЕКЦЫЯ 3. ЗВЫЧАІ, АБРАДЫ, РЫТУАЛЫ Ў НАРОДНАЙ ТРАДЫЦЫІ

1. *Паняцце «абрад», «звычай», «рытуал» і іх функцыі.*
2. *Сямейна-родавыя абрады.*
3. *Рэжысёрскае бачанне абрадавага дзейства.*
4. *Этапы работы рэжысёра над распрацоўкай традыцыйнага абраду.*

Культурная спадчына беларускага народа захоўваецца і перадаецца праз складаны комплекс традыцыйных форм паводзін, якія прынята абазначаць паняццямі «звычай», «абрад» і «рытуал». Гэтыя тэрміны часта ўжываюцца як сінонімы ў паўсядзённай мове, аднак насамрэч маюць адрозненні.

*Абрад* – асаблівы спосаб перадачы новым пакаленням пэўных ведаў, норм, паводзінаў, ідэй. Гэта сімвалічна насычаная дзеянне, прымеркаванае да пэўнага жыццёвага або каляндарнага цыклу, якое заўсёды мае дакладны сцэнарый (сюжэт).

*Звычай* – гэта ўсталяваная, традыцыйная форма паводзін, якая рэгулюе паўсядзённае жыццё. Ён мае сацыяльна-нарматыўную функцыю, замацоўвае калектыўны вопыт. Гэта зацверджаная норма сацыяльных паводзін, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне і рэгулюе паўсядзённае жыццё грамадства. Звычай у адрозненні ад абраду часта не нясе сакральнай сутнасці, паўтараецца па звычцы, завядзёнцы: «так заўсёды рабілі», «так належыць».

*Рытуал* – найбольш распаўсюджаны варыянт абраднага дзеяння, дзе кожны элемент абазначае выпрацаваны звычаем і ўсталяваны парадак, цырыманіял. Рытуал выконвае камунікатыўную і ідэнтыфікацыйную функцыі. Гэтыя формы ў народнай традыцыі ствараюць магчымасці для перадачы каштоўнасцей, міфалагічных уяўленняў і сацыяльнай структуры.

Сямейна-родавыя абрады беларусаў уяўляюць сабой складаную сістэму, якая інтэгруе асобу ў сацыяльную і метафізічную структуру роду. Раней абрады былі ключавым механізмам захавання памяці, перадачы каштоўнасцей і забеспячэння сацыяльнага парадку.

Этапы работы рэжысёра над распрацоўкай традыцыйнага абраду: збор крыніц (навуковыя працы, палявыя запісы, відэаматэрыялы); вызначэнне аўтэнтычных элементаў: песень, танцаў, касцюмаў, прадметаў; выдзяленне структурных кампанентаў абраду; рэканструкцыя сімвалічных элементаў і іх інтэрпрытацыя; сцэнічная адаптацыя; стварэнне драматургічнай лініі – абрадавае дзеянне як гісторыя з завязкай (менавіта ў гэтым эпізодзе пачынаецца драматургічны твор, вызначаецца канфлікт, пазіцыі бакоў, персанажаў), развіццём (існуе як лагічная і эмацыйная падрыхтоўка галоўнай падзеі), кульмінацыяй (найвышэйшы эмацыйны пункт у развіцці тэмы абраду) і развязкай (завяршэнне абрадавай дзеі, якая дае магчымасць удзельнікам і гледачам ўсвядоміць яго сэнс); рэпетыцыйны працэс; прасторавае вырашэнне абрадавага дзейства.

## ЛЕКЦЫЯ 4. ПАНЯЦЦЕ «ДРАМАТУРГІЯ» І ЯГО АСНОЎНЫЯ КАМПАНЕНТЫ

*1. Паняцці «драма», «драматургія».*
*2. Вылучэнне канструктыўных элементаў твору.*
*3. Сюжэт і кампазіцыя сцэнарыя.*
*4. Мантаж як творчы метад сцэнарыста і рэжысёра.*

Паняцце «драматургія» з'яўляецца цэнтральным не толькі для тэатральнага мастацтва, кіно, тэлебачання, але і для рэжысуры народных абрадаў і свят. Яно азначае тэорыю пабудовы драматычных твораў, прынцыпы арганізацыі дзеяння і канфлікту ў часе і прасторы.

Гістарычна і тэарэтычна неабходна размяжоўваць блізкія, але не ідэнтычныя паняцці «драма» і «драматургія».

Драма (ад грэч. drama – дзеянне) – гэта, перш за ўсё, адзін з трох асноўных літаратурных родаў (разам з эпасам і лірыкай), а таксама жанравы тэрмін. Як род літаратуры драма характарызуецца перавагай дзеяння над апавяданнем, асноўным спосабам мастацкага адлюстравання рэчаіснасці ў ёй з'яўляецца дыялог, а структура будуюцца на канфлікце. Як жанр, драма адрозніваецца ад трагедыі і камедыі больш блізкім да рэчаіснасці, складаным і супярэчлівым характарам канфлікту.

Драматургія – гэта сістэма прынцыпаў, законаў і прыёмаў арганізацыі матэрыялу (падзей, характараў, дыялогаў) у адзінстве часу, прасторы і дзеяння. Яна адказвае на пытанне, як з асобных элементаў ствараецца цэласны твор. У сучасным разуменні драматургія ўжываецца да любога твора, заснаванага на развіцці канфлікту і дзеянні ў тым ліку народных абрадаў і свят.

Любы драматургічны твор, грунтуецца на наборы ўзаемазвязаных канструктыўных элементаў. Іх вылучэнне і аналіз дазваляюць раскрыць механізмы яго ўздзеяння на гледача.

*Тэма* – гэта прадмет мастацкага адлюстравання, асноўны круг праблем, якія падымае абрад, свята.

*Ідэя* – асноўная думка абраду, свята іх цэнтральная праблема, ацэначная пазіцыя рэжысёра па адносінах да адлюстраванай рэчаіснасці. Калі тэма адказвае на пытанне «пра што», то ідэя – «што рэжысёр хоча сказаць».

*Канфлікт* – сутыкненне процілеглых сіл, інтарэсаў, ідэй або жаданняў. Ён з'яўляецца рухавіком драматычнага дзеяння. Канфлікт можа быць знешнім і ўнутраным.

*Персанажы* – носьбіты дзеяння і канфлікту. Іх мэты, матывы, унутраныя супярэчнасці фарміруюць падзеі.

*Падзея* – факт, які змяняе сітуацыю або стаўленне персанажаў да яе. Сукупнасць падзей фарміруе фабулу.

*Сітуацыя* – сукупнасць абставін, у якіх апынаюцца персанажы ў пэўны момант часу. Яна стварае магчымасці для развіцця канфлікту і дзеяння.

Гэтыя элементы ў сваёй сукупнасці складаюць матэрыял з якога далей будуюцца сюжэт і кампазіцыя сцэнарыя.

Мантаж з'яўляецца фундаментальным інструментам арганізацыі мастацкай формы абрадаў і свят, вызначаючы іх кампазіцыйную цэласнасць і структурную лагічнасць. Спецыфіка свята як дзеяння, разгорнутага адначасова ў некалькіх прасторавых і часавых плоскасцях, дыктуе выкарыстанне паралельнага мантажу. У адрозненне ад свята, абрадавае дзейства, лакалізаванае ў пэўнай прасторы (як адкрытай, так і закрытай), будуецца на прынцыпах паслядоўнага мантажу. Гэты падыход забяспечвае кампазіцыйную сувязь асобных эпізодаў, надаючы дзеянню рытуальную плаўнасць і лагічную завершанасць.

Важнай функцыяй мантажу з'яўляецца фарміраванне рытмічнага і сэнсавага малюнка шляхам паўтору пэўных элементаў, што забяспечвае ўстойлівасць усёй канструкцыі. Гэты працэс суправаджаецца актыўным выкарыстаннем вобразна-выяўленчых сродкаў: колера-музычна-пластычных метафар і рэчыўнай сімволікі, якія выступаюць у якасці асноўных праваднікоў мастацкай ідэі.

## ЛЕКЦЫЯ 5. ПАНЯЦЦІ ДРАМАТУРГІІ: ФАБУЛА, СЮЖЭТ, СІНАПСІС, ІХ ФУНКЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ

*1. Азначэнне паняцця фабула.*
*2. Азначэнне паняцця сюжэт.*
*3. Азначэнне паняцця сінапсіс.*
*4. Сэнсавая інтэлектуальная аснова драмы.*

Драматургія як мастацкая сістэма грунтуецца на шэрагу ключавых катэгорый, што вызначаюць структуру, развіццё і сэнсавую нагружанасць драматычнага твора. Сярод іх асноўнымі з'яўляюцца фабула, сюжэт і сінапсіс. Гэтыя паняцці, нягледзячы на іх цесную ўзаемасувязь, маюць адметныя функцыянальныя асаблівасці, што робіць іх важнымі інструментамі ў працэсах стварэння, аналізу і інтэрпрэтацыі свят і абрадаў.

*Фабула* (ад лац. fabula — апавяданне, паданне) – гэта аб'ектыўная паслядоўнасць падзей у іх лагічна-часавой сувязі, як яны маглі б адбывацца ў рэальнасці. Фабула выступае як «матар'ял» для сюжэту – базавы пласт, які ўключае ўсе падзеі твору ў іх храналагічным парадку. Яна забяспечвае лагічную цэласнасць аповеду, усталёўвае прычынна-следчыя сувязі паміж падзеямі. Служыць асновай для сюжэтнай кампазіцыі, стварае «каркас» дзеяння.

*Сюжэт* – гэта мастацка арганізаваная паслядоўнасць падзей у тэксце, дзе фабульны матэрыял падвергнуты кампазіцыйным, часавым і сэнсавым трансфармацыям. Сюжэт уключае не толькі падзеі, але і іх падачу праз прызму апавядальніка, персанажаў, дэталей, дыялогаў.

Функцыянальнасць сюжэту: перабудова храналогіі для стварэння напружання, эмацыйнага ўздзеяння. Выяўленне аўтарскай пазіцыі: праз

адбор і кампаноўку падзей, акцэнтаў, расстаноўку персанажаў. Стварэнне дынамікі і рытму драматычнага дзеяння. Раскрыццё вобразаў і ідэй: сюжэтныя павароты і канфлікты выкрываюць унутраны свет персанажаў, філасофскія праблемы.

*Сінапсіс* (ад грэч. synopsis – агляд, агульны погляд) – кароткі пераказ асноўнага зместу драматычнага твору (свята, абраду), яго канфлікту, галоўных падзей і развязкі. Гэта не мастацкі, а інфармацыйна-аналітычны тэкст.

Сінапсіс служыць для разумення твору і яго будучага ўвасаблення. У працэсе стварэння сцэнарыя сінапсіс часта выступае як папярэдні план, канцэптуальная схема, што дазваляе правесці канструктыўны аналіз яго логікі і вылучыць самае істотнае, аддзяліць галоўны сюжэт ад другасных.

Такім чынам, яснае разуменне і адрозненне фабулы, сюжэту і сінапсісу дазваляе не толькі дакладна аналізаваць існуючыя драматургічныя творы, але і свядома выкарыстоўваць гэтыя інструменты ў працэсе стварэння народных свят і абрадаў, забяспечваючы іх цэласнасць, лагічнасць і мастацкую выразнасць.

# ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1. Тэматыка практычных заняткаў

*Тэма 1.* Паняцці драматургіі: фабула, сюжэт, сінапсіс, іх функцыянальнасць (4 гадзіны).

*Пытанні*

1. Паняцці «фабула», «сюжэт», «сінапсіс».
2. Чым фабула адрозніваецца ад сінапсісу і якая іх роля ў драматургіі народных абрадаў і свят.
3. У чым асаблівасці сюжэту абрадаў і свят.

*Тэма 2.* Спецыфіка драматургіі народных абрадаў і свят (6 гадзін)

*Пытанні*

1. Адрозненні драматургіі народных абрадаў і свят ад іншых драматургічных форм.
2. Структура народнага свята і яе уплыў на драматургічную пабудову.
3. Асноўныя этапы развіцця драматургічнага дзеяння ў традыцыйным народным абрадзе.
4. У чым складанасць перанясення аўтэнтычнага абраду на тэатральную сцэну.

*Тэма 3.* Рэжысёрская задума ў працы над сцэнарыям народнага свята, абраду (6 гадзін).

*Пытанні*

1. Задума і сцэнарны план народнага свята.
2. Асноўныя этапы работы над сцэнарыем народнага свята.
3. Асноўныя этапы работы над сцэнарыем традыцыйнага абраду.
4. Агульныя і спецыфічныя рысы сцэнарыя народных абрадаў і свят і іншых драматургічных форм.

*Тэма 4.* Кампазіцыйныя элементы сцэнарыя і законы кампазіцыі (6 гадзін).

*Пытанні*

1. Кампазіцыйныя элементы сцэнарыя народных абрадаў і свят.
2. Апісанне законаў кампазіцыйнай пабудовы сцэнарыя.
3. Ахарактарызуйце наступную кампазіцыйную структуру: завязка – развіццё – кульмінацыя – развязка – фінал.
4. Функцыі мантажа пры стварэнні сцэнарыя народнага свята.

*Тэма 5.* Канфлікт у драматургіі народнага свята. Скразное дзеянене і супрацьдзеянне (6 гадзін).

*Пытанні*

1. Разуменне канфлікту ў драматургіі абрадаў і свят.
2. Канфлікт і лінія барацьбы.
3. Паняцці: скразное дзеянне і супрацьдзеянне.
4. Асаблівасці вызначэння канфлікту ў традыцыйным абрадзе.

*Тэма 6.* Мастацкі вобраз народнага свята (6 гадзін).

*Пытанні*

1. Азначэне мастацкага вобразу.
2. Мастацкі вобраз і яго роля ў народным свяце.
3. Карэнныя адрозненні мастацкага вобразу народнага свята ад мастацкага вобразу традыцыйнага абраду.
4. Растлумачце сэнсавую сутнасць мастацкага вобразу.

*Тэма 7.* Выразныя сродкі народнага свята, абраду (6 гадзін).

*Пытанні*

1. Выразныя сродкі: паняцце і сутнасць.
2. Метафарычнасць, сімволіка, алегарычнасць у святочным дзеянні.
3. У чым асаблівасці сімвала як выразнага сродку народнага свята, абраду.
4. Арозненні сімвала ад метафары.

*Тэма 8.* Драматургія традыцыйнага абраду (6 гадзін).

*Пытанні*

1. Структура і архітэктоніка традыцыйнага абраду.
2. Тэатралізацыя ў традыцыйным абрадзе.
3. Роля рытму ў традыцыйным абрадзе.
4. Пластыка і харэаграфія як найважнейшыя сродкі пабудовы абрадавага дзеяння.

*Тэма 9.* Драматургія шэсцяў народных свят (6 гадзін).

*Пытанні*

1. Мадэль драматургіі шэсця ў народным свяце.
2. Структура шэсця.
3. Асноўныя прынцыпы драматургіі шэсця.
4. Элементы карнавалу ў шэсці, іх сімволіка і і змястоўная сутнасць.

*Тэма 10.* Сцэнарная распрацоўка эпізода свята на аснове фальклорнага, музычнага, выяўленчага, вуснапаэтычнага матэрыялу (6 гадзін).

*Пытанні*

1. Тыпы дакументаў, што выкарыстоўваюцца для пабудовы сцэнарыя на аснове фальклорнага, музычнага, выяўленчага, вуснапаэтычнага матэрыялу.

2. Суадноснасць і ўзаемаабумоўленаць фальклорнага, музычнага, выяўленчага, вуснапаэтычнага матэрыялаў у драматургіі свята.

3. Эпізод як фарміруючая адзінка народнага свята.

4. Дзейсная структура эпізода. Канфлікт.

*Тэма 11.* Рэканструкцыя, рэстаўрацыя, трансфармацыя народных абрадаў і свят (6 гадзін).

*Пытанні*

1. Паняцце і сутнасць рэканструкцыі народных абрадаў і свят.
2. Паняцце і сутнасць рэстаўрацыі народных абрадаў і свят.
3. Паняцце і сутнасць трансфармацыі народных абрадаў і свят.
4. Сучасныя рытуалы і абрады, іх функцыі.

*Тэма 12.* Методыка стварэння літаратурнага сцэнарыя трыдыцыйнага абраду (8 гадзін).

*Пытанні*

1. Асноўныя этапы працы над сцэнарыем трыдыцыйнага абраду.
2. Сцэнарны ход.
3. Тэарытычнае тлумачэнне сцэнарыя трыдыцыйнага абраду.
4. Літаратурны запіс сцэнарыя трыдыцыйнага абраду.
5. Асаблівасці адбору матэрыялу для стварэння сцэнарыя трыдыцыйнага абраду.

*Тэма 13.* Методыка стварэння літаратурнага сцэнарыя народнага свята (8 гадзін).

*Пытанні*

1. Народнае свята. Паняцце.
2. Задума і сцэнарны план народнага свята.
3. Пляцоўка дзеяння. Прыроднае і архітэктурнае асяроддзе.
4. Сімволіка свята.
5. Літаратурны сцэнарый і дынаміка пrасторавых вырашэнняў.

### 3.2. Пералік пытанняў па тэмах індывідуальных заняткаў.

*Індывідуальны занятак № 1.*

Сцэнарная распрацоўка эпізода свята на аснове фальклорнага, музычнага, выяўленчага, вуснапаэтычнага матэрыялу.

*Індывідуальны занятак № 2.*

Сцэнарная распрацоўка літаратурнага сцэнарыя трыдыцыйнага абраду

*Індывідуальны занятак № 3.*

Сцэнарная распрацоўка літаратурнага сцэнарыя народнага свята

## 3.3. Самастойная работа студэнтаў

Вынікі самастойнай работы студэнтаў здзяйсняюцца выкладчыкамі кафедры суадносна з патрабаваннямі да вучэбнага працэса дзённага і завочнага навучання. Кантраляванне самастойнай работы студэнтаў адбываецца на экзамене і заліку згодна тэм пройдзеных раздзелаў.

# IV. РАЗДЗЕЛ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ.

## 4.5. Крытэрыі ацэнкі ведаў студэнтаў па 10-бальнай шкале.

**10 балаў** (надзвычай выдатна) – заслугоўвае студэнт, які паказаў усебаковае і сістэматычнае веданне вучэбнага матэрыялу, беспамылкова выканаў усе практычныя і індывідуальныя заданні па вучэбнай дысцыпліне; глыбока засвоіў матэрыял, прадугледжаны вучэбнай праграмай для самастойнага вывучэння, а таксама знаёмы з матэрыялам, не запланаваным праграмай; актыўна працаваў на лекцыйных, практычных і індывідуальных занятках па дадзенай дысцыпліне. Гэта студэнт, які паказвае веды, большыя за праграмны матэрыял і які не дапусціў памылак пры выкананні практычных заданняў і падчас адказу на экзамене, засвоіў і свабодна аперыруе асноўнай і рэкамендаванай для самастойнага вывучэння літаратурай, выказвае свае меркаванні па прадмеце, дакладна карыстаецца тэрміналогіяй, паказвае жаданне, здольнасць і імкненне да самастойнага папаўнення гэтых ведаў.

**9 балаў** (выдатна) – заслугоўвае студэнт, які паказаў усебаковае і сістэматычнае веданне асноўнага вучэбнага матэрыялу, беспамылкова выканаў усе практычныя і індывідуальныя заданні па вучэбнай дысцыпліне; засвоіў матэрыял, прадугледжаны вучэбнай праграмай для самастойнага вывучэння; актыўна працаваў на лекцыйных, практычных, індывідуальных занятках і і не дапусціў памылак пры выкананні практычных заданняў і падчас адказу на экзамене, засвоіў і вольна аперыруе асноўнай і рэкамендаванай для самастойнага вывучэння літаратурай, дакладна карыстаецца тэрміналогіяй, паказвае сістэматычны характар ведаў, жаданне, здольнасць і імкненне да самастойнага папаўнення гэтых ведаў.

**8 балаў** (амаль выдатна) – заслугоўвае студэнт, які паказаў поўнае веданне асноўнага вучэбнага матэрыялу, выканаў усе практычныя і індывідуальныя заданні па вучэбнай дысцыпліне; засвоіў матэрыял, прадугледжаны вучэбнай праграмай для самастойнага вывучэння; актыўна працаваў на лекцыйных, практычных, індывідуальных занятках і не дапусціў памылак пры выкананні практычных заданняў, падчас адказу на экзамене, засвоіў усю асноўную і рэкамендаваную для самастойнага вывучэння літаратуру, паказаў сістэматычны характар ведаў, жаданне, здольнасць і імкненне да самастойнага папаўнення гэтых ведаў.

**7 балаў** (вельмі добра) – заслугоўвае студэнт, які паказаў поўнае веданне асноўнага вучэбнага матэрыялу, выканаў галоўныя практычныя і індывідуальныя заданні па вучэбнай дысцыпліне; засвоіў асноўны матэрыял, прадугледжаны вучэбнай праграмай для самастойнага вывучэння; праявіў актыўнасць на лекцыйных, практычных, індывідуальных занятках і не дапусціў сутнасных памылак пры выкананні заданняў, падчас адказу на экзамене, засвоіў усю асноўную і рэкамендаваную для самастойнага вывучэння літаратуру, паказаў сістэматычны характар ведаў, жаданне, здольнасць і імкненне да самастойнага папаўнення гэтых ведаў.

**6 балаў (добра)** – заслугоўвае студэнт, які паказаў дастаткова поўнае веданне асноўнага вучэбнага матэрыялу, выканаў галоўныя заданні, дадзеныя для практычнага і індывідуальнага выканання; засвоіў асноўны матэрыял, прадугледжаны вучэбнай праграмай для самастойнага вывучэння, прымаў дастаткова актыўны ўдзел у лекцыйных, практычных, індывідуальных занятках па дадзенай дысцыпліне і веды якога маюць сістэматычны характар.

**5 балаў** (амаль добра) – заслугоўвае студэнт, які паказаў веданне асноўнага вучэбнага матэрыялу па праграме дысцыпліны ў аб'ёме, неабходным для далейшага навучання і працы па абранай прафесіі; выконваў асноўныя заданні, дадзеныя для практычнага і індывідуальнага выканання; засвоіў матэрыял, прадугледжаны вучэбнай праграмай для самастойнага вывучэння; прымаў дастаткова актыўны ўдзел у лекцыйных, практычных, індывідуальных занятках па дадзенай дысцыпліне, але дапускаў памылкі пры выкананні практычных заданняў і падчас адказу на экзамене; студэнт, які валодае неабходнымі ведамі па праграме дысцыпліны для ліквідацыі пагрэшнасцей самастойна.

**4 балы** (дастаткова здавальняюча) – заслугоўвае студэнт, які паказаў веданне асноўнага вучэбнага матэрыялу па праграме дысцыпліны ў аб'ёме, неабходным для далейшай вучобы і авалодання прафесіяй; выконваў асноўныя заданні, дадзеныя для практычнага і індывідуальнага выканання; імкнуўся засвоіць матэрыял, прадугледжаны вучэбнай праграмай для самастойнага вывучэння, але не прымаў актыўнага удзелу ў лекцыйных, практычных, індывідуальных занятках па дадзенай дысцыпліне; дапускаў некаторыя памылкі пры выкананні заданняў і адказе на экзамене, але які тым не менш валодае неабходнымі ведамі для ліквідацыі прабелаў пад кіраўніцтвам выкладчыка.

**3 балы** (здавальняюча) – заслугоўвае студэнт, які паказаў веданне асноўнага вучэбнага матэрыялу па праграме дысцыпліны ў аб'ёме, неабходным для далейшай вучобы і авалодання прафесіяй, выконваў асноўныя заданні, дадзеныя для практычнага і індывідуальнага выканання; імкнуўся засвоіць матэрыял, прадугледжаны вучэбнай праграмай для самастойнага вывучэння, але не прымаў актыўнага удзелу ў лекцыйных, практычных, індывідуальных занятках па дадзенай дысцыпліне; дапускаў значныя памылкі пры выкананні заданняў і адказе на экзамене, але які валодае мінімумам ведаў для ліквідацыі прабелаў пад кіраўніцтвам выкладчыка.

**2–1 балы** (нездавальняюча) – заслугоўвае студэнт, адказ якога выяўляе значныя прабелы ў ведах большай часткі асноўнага вучэбнага матэрыялу па праграме; студэнт, які не выканаў асноўныя заданні, дадзеныя для практычнага і індывідуальнага выканання; не засвоіў матэрыял, прадугледжаны вучэбнай праграмай для самастойнага вывучэння; студэнт, які не адпрацаваў асноўныя лекцыйныя, практычныя, індывідуальныя заняткі па дадзенай дысцыпліне; не здольны працягваць навучанне або прыступіць да прафесійнай дзейнасці без дадатковых заняткаў з выкладчыкам па адпаведнай дысцыпліне.

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ПЫТАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНА

1. Народнае свята. Паняцце.
2. Задума і сцэнарны план свята.
3. Тэарытычнае тлумачэнне сцэнарыя абрада, свята.
4. Структура народнага свята.
5. Элементы структуры дзеяння ў кампазіцыі народнага свята.
6. Асноўныя этапы працы над сцэнарыем народнага свята.
7. Пляцоўка дзеяння. Прыроднае і архітэктурнае асяроддзе.
8. Прадстаўленне відовішча як цэнтральная ідэалагічная частка свята.
9. Задума – вобразнае бачанне свята.
10. Сімволіка свята, абрада. Яго мастацкае дамінанта.
11. Супадпарадкаванасць ідэйна-тэматычнай накіраванасці відовішча звышзадачы свята.
12. Сацыяльныя функцыі народных свят і абрадаў.
13. Сцэнарны «ход» і мантажны прыём як спосаб кампазіцыйнай арганізацыі народных свят.
14. Абрадава-рытуальныя дзеянні на адкрытых пляцоўках.
15. Формы рытуальных дзей. Асаблівасці драматургіі.
16. Літаратурны сцэнарый абраду, свята і яго часткі.
17. Шэсці ў народных святах.
18. Асноўныя віды шэсцяў народных свят, іх прызначэнне, функцыі.
19. Элементы карнавалу ў шэсці народных свят, сімволіка і сутнасць.
20. Асноўноныя заканамернасці драматургіі шэсця.
21. Мадэль драматургіі шэсця ў народным святе (на выбар студэнта).
22. Масленічны карнавал: паняцце і сацыяльна-псіхалагічная сутнасць.
23. Карнавалы ў розных святах народнага календару.
24. Сюжэт і фабула ў драматургічным творы.
25. Характарыстыка асноўных форм ўвасаблення народных абрадаў свят.
26. Асноўныя прынцыпы драматургіі народнага свята.
27. Архітэктоніка сцэнарыя народнага свята, абраду.
28. Гук і святло ў сродках выразнасці народнага свята.
29. Структура традыцыйнага абраду.
30. Асноўныя прынцыпы драматургіі народнага абраду.
31. Паяняцце драма і яе спецыфічныя рысы.
32. Характарыстыка сродкаў мастацкай выразнасці ў драматургіі свята.
33. Літаратурны сцэнарый і дынаміка прасторавых вырашэнняў свята.
34. Асаблівасці адбору матэрыялу для стварэння народных абрадаў і свят.
35. Рытуальныя формы народных свят і абрадаў.
36. Метафарычнасць, сімволіка, алегарычнасць у святах і абрадах.
37. Паняцце «аўтэнтычны фальклор» ў сцэнарыі народнага свята.
38. Роля дыктарскіх тэкстаў і рэпартажаў ў народных святах.
39. Нумар і эпізод у драматургіі народнага свята.
40. Творчы працэс сцэнарнай распрацоўкі народнага абраду.

# 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## 5.1. Вучэбная праграма курса

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар універсітэта
_____________Н. У. Карчэўская
_____________2025 г.
Рэгістрацыйны №

**ДРАМАТУРГІЯ**
**НАРОДНЫХ АБРАДАЎ І СВЯТ**

*Вучэбная праграма*
*ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят*

2025

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта агульнай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 21.08.2023 № 270; вучэбнага плана па спецыяльнасці 6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*К. І. Шык*, старшы выкладчык кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат педагагічных навук.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*В. М. Наумчык,* загадчык кафедры агульнай і прафесійнай педагогікі ўстановы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі», доктар педагагічных навук, прафесар;

*Д. В. Герасімёнак,* загадчык кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі.

**РЭКАМЕНДАВАНЫ ДА ЗАЦВЕРДЖАННЯ:**

*кафедрай рэжысуры* ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № __ ад _______2025);

*Прэзідыумам навукова-метадычнага савета* ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № __ ад ______2025)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Драматургія народных абрадаў і свят» уключана ў модуль «Асновы драматургіі і сцэнарнага майстэрства» вучэбнага плана спецыяльнасці 6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят.

Вучэбная дысцыпліна «Драматургія народных абрадаў і свят» накіравана на падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў, здольных да самастойнай творчай дзейнасці па сучасных станадартах у сферы культуры. Асновай навучання з'яўляецца індывідуальны падыход, які ўлічвае назапашаны вопыт, асабістыя якасці і творчы патэнцыял кожнага студэнта.

Вучэбная дысцыпліна «Драматургія народных абрадаў і свят» цесна ўзаемазвязана з іншымі дысцыплінамі спецыяльнага цыкла – «рэжысура фальклорных прадстаўленняў», «тэорыя драмы», «асновы сцэнарнага майстэрства».

*Мэта* вучэбнай дысцыпліны – фарміраванне ў студэнтаў неабходнага комплексу ведаў пра заканамернасці і асноўныя тэндэнцыі развіцця драматургіі народных абрадаў і свят.

*Задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– раскрыць ідэйна-мастацкія, філасофскія і культуралагічныя карані драматургіі народных абарадаў і свят;

– вызначыць месца драматургіі ў абрадах і святах;

– сістэматызаваць тэарэтычныя веды студэнтаў у галіне гісторыі і тэорыі драматургіі;

– вывучыць асноўныя напрамкі, школы драматургіі абрадаў і свят;

– раскрыць стылявыя асаблівасці рэжысёраў свят, якія аказалі ўплыў на развіццё айчыннай і сусветнай святочнай культуры.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Драматургія народных абрадаў і свят» накіравана на фарміраванне базавай прафесійнай кампетэнцыі: умець выкарыстоўваць навукова-тэарэтычныя веды па драматургіі для рашэння творчых задач па ўвасабленні народных абрадаў і свят.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен:

*ведаць*:

– гістарычныя перадумовы ўзнікнення драматургіі;

– класіфікацыю, вытокі народных абрадаў і свят;

– структурную кампазіцыю народных абрадаў і свят;

– асноўныя складнікі сцэнарна-драматургічнай асновы народных свят;

– этапы работы над стварэннем сцэнарыя абрадаў і свят.

*умець:*

– адбіраць фальклорны, мастацка-літаратурны, дакументальны матэрыял для стварэння пэўнага сцэнарыя народных абрадаў і свят;

– ствараць метадам кампіляцыі новы сцэнарый на аснове іншых сцэнарных распрацовак;

– пісаць сцэнарыі народных абрадаў і свят;

– карыстацца і адбіраць патрэбны паэтычны, музычны, мастацка-

выяўленчы, відэаматэрыял па тэматыцы свята, абрада;

– ствараць па законах драматургіі народнае свята, абрад.

*валодаць:*

– ведамі пра беларускія народныя святы і абрады;

– методыкай распрацоўкі сцэнарыяў народных абрадаў і свят;

– уменнем працаваць з фальклорнымі, літаратурнымі, дакументальнымі крыніцамі пры стварэнні народнага свята, абрада.

– метадамі рэстаўрацыі, рэканструкцыі, трансфармацыі абрадаў і свят;

– навыкамі аналіза драматургічнай асновы народнага абрадавага свята.

Адукацыйны працэс па дадзенай вучэбнай дысцыпліне накіраваны не толькі на набыццё студэнтамі тэарэтычных ведаў, практычных уменняў і навыкаў па прафесіі рэжысёр, але і на развіццё творчага патэнцыялу, каштоўнасна-сэнсавых арыентацый, духоўна-асобасных якасцяў, а таксама на фарміраванне светапогляднай пазіцыі, крэатыўнага мыслення, грамадзянска-патрыятычных якасцей асобы, гатовай да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны «Драматургія народных абрадаў і свят» усяго прадугледжана 104 гадзіны. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 12 гадзін, практычныя – 80 гадзін, індывідуальныя – 12 гадзін.

Рэкамендуемая форма бягучай атэстацыі – аналіз драматургіі народнага свята (па выбары студэнта).

Рэкамендуемая форма прамежкавай атэстацыі – залік; экзамен.

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 6 залікова адзінак.

## ЗМЕСТ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Тэма 1. Уводзіны. Прадмет і задачы курса. Роля народных абрадаў і свят у жыцці дзяржавы і грамадства

Прадмет вывучэння зместу дысцыпліны «Драматургія народных абрадаў і свят». Месца дысцыпліны ў сістэме навучання па спецыяльнасці 6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят. Мэта і задачы дысцыпліны. Парадак праходжання вучэбнай праграмы, лекцыі, практычныя, індывідуальныя, творчыя заданні, формы кантролю. Пералік розных крыніц літаратуры па дысцыпліне. Святы і іх прызначэнне ў грамадсве. Значэнне народных абрадаў і свят у святочнай культуры Беларусі.

### Тэма 2. Класіфікацыя народных свят і іх характэрныя асаблівасці

Асноўныя прынцыпы класіфікацыі народных свят і іх сістэматызацыя. Тыпы народных свят. Святы зімовага цыклу. Святы вясновага цыклу. Святы летняга цыклу. Святы восеньскага цыклу. Каляндарна-аграрныя святы. Сямейна-родавыя святы. Хрысціянскія святы. Агульныя характэрныя асаблівасці народных свят. Цыклічнасць і паўтаральнасць народных свят. Рытуалізаванасць народных свят. Калектыўнасць народных свят. Выхаваўчы патэнцыял народнага свята.

### Тэма 3. Звычаі, абрады, рытуалы ў народнай традыцыі

Паняцце «абрад», «звычай», «рытуал» і іх функцыі. Сямейна-родавыя абрады. Галоўныя кампаненты абраду: слова, сімвал, музыка, пластыка, элементы мастацка-дэкаратыўнага мастацтва. Драматаргічны аналіз абраду. Рэжысёрскае бачанне абрадавага дзейства. Мастацка-дэкаратыўнае рашэнне абраду. Музычнае рашэнне абраду. Пластыка-харэаграфічнае рашэнне абраду. Мова абраду. Этапы работы рэжысёра над распрацоўкай традыцыйнага абраду.

### Тэма 4. Паняцце «драматургія» і яго асноўныя кампаненты

Паняцці «драма», «драматургія». Вылучэнне канструктыўных элементаў твору. Архітэктоніка. Асноўныя кампаненты драматургічнага твору. Ідэйна-тэматычны змест і драматургічны ход. Сюжэт і кампазіцыя сцэнарыя. Сэнсавыя вузлы. Драматургічныя метады і прыёмы. Мантаж як творчы метад сцэнарыста і рэжысёра. Лагічны, паралельны, храналагічны, кантрасны, асацыятыўны мантаж.

### Тэма 5. Паняцці драматургіі: фабула, сюжэт, сінапсіс, іх функцыянальнасць

Азначэнне паняцця фабула. Сюжэт і яго кампазіцыя. Асноўныя адрозненні фабулы ад сюжэту. Сінапсіс – азначэнне. Сінапсіс і яго функцыянальнасць. Сцэнарыі народных абрадаў і свят – вызначэнне фабулы, сюжэту, сінапсісу. Характар народных персанажаў. Сэнсавая інтэлектуальная аснова драмы. Сцэнічная абстаноўка, тэкст і музычная кампазіцыя. Сінтэтычны характар народнага свята і мастацкі мантаж.

### Тэма 6. Спецыфіка драматургіі народных абрадаў і свят

Цыклічнасць і каляндарнасць. Абрады арганічна ўплецены ў прыродны (аграрны) і рэлігійны каляндар. Кожны цыкл мае свае асаблівасці: зімовы цыкл: адраджэнне сонца, барацьбы святла з цемрай і г.д.; вясновы цыкл: уваскрэсенне прыроды, сустрэча вясны; летні цыкл: апагей жыццёвай сілы, агню-вады, магіі раслін; восеньскі цыкл: збор ураджаю, падзяка продкам і г.д. Мова сімвалаў і сінтэз мастацтваў. Ролевыя архетыпы і калектыўны герой. Прастора і час. Рытуальны тэкст, узаемадзеянне чалавека з Богам, прыродай, касмасам і ўласнай супольнасцю для захавання і аднаўлення сусветнай гармоніі.

### Тэма 7. Рэжысёрская задума ў працы над сцэнарыям народнага свята, абраду

Тэма і ідэя святочнай даты, месца правядзення свята, абраду, колькасць удзельнікаў, бюджэт свята. Задума як задуманы план дзеянняў. Зыходнае прадстаўленне аўтара, драматурга, сцэнарыста, рэжысёра пра будучыню твора. Складнікі задумы сцэнарыя: планы, заяўкі, накіды, эцюды, эскізы, рэжысёрская эксплікацыя. Задума драматургічная і рэжысёрская. Драматургічная задума ўключае: вызначэнне калізій, падзейнага шэрагу, кампазіцыйнай пабудовы, кульмінацыйнага моманту; напісанне сцэнарна-рэжысёрскага ходу.

### Тэма 8. Кампазіцыйныя элементы сцэнарыя і законы кампазіцыі

Разуменне кампазіцыі як складовай часткі сцэнарнай работы. Кампазіцыйныя цэласнасць. Мантаж. Злучэнне. Кмпазіцыйныя задачы як сродак развіцця ідэйна-тэматычнай задумы. Кампазіцыйная пабудова. Адзінства дзеяння сцэнарыя. Стварэнне перадсвяточнай атмасферы. Элементы кампазіцыі: Экспазіцыя. Пралог. Завязка. Развіццё дзеяння. Кульмінацыя. Развязка. Фінал. Эпілог. Законы кампазіцыі. Кампазіцыйная завершанасць сцэнарыя.

### Тэма 9. Канфлікт у драматургіі народнага свята. Скразное дзеянене і супрацьдзеянне

Канфлікт і яго азначэнне. Віды канфлікту. Тыпы канфлікту. Унутраны і знешні канфлікт. Канфлікт адкрытага і схаванага зместу. Вызначэнне канфлікту ў народным абрадзе, свяце. Касмічны канфлікт. Скразное дзеянне і супрацьдзеянне ў свяце. Дрматычная сітуацыя. Антаганіст і пратаганіст. Альтэрнатыўныя фактары драматургічнай сітуацыі. Дамінанты персанажаў. Арыенціры канфлікту. Скразное дзеянне персанажа “матывіроўка – дзеянне – дасягненне мэты”.

## Тэма 10. Мастацкі вобраз народнага свята

Мастацкі вобраз – паняцце. Мастацкі вобраз народнага свята, абраду. Асацыятыўнасць, парадаксальнасць, метафарычнасць мастацкага вобраза. Шматзначнасць і багацце вобразнай думкі. Спецыфічная форма адлюстравання рэчаіснасці. Нараджэнне твору ў матэрыяльных формах: пластычнай, гукавой, жэстамімічнай, славеснай). Вобраз як адлюстраванне розных з’яў рэчаіснасці. Мастацкі вобраз як структура. Паняцці: сузіранне, перажыванне, катарсіс. Вобраз як сузіранне і эстэтычнае перажыванне. Вобраз свята як сукупнасць выразна-мастацкіх складнікаў (геаграфія свята, музыка, сцэнаграфія, мізансцэны, пластыка, слова і іншае).

## Тэма 11. Выразныя сродкі народнага свята, абраду

Выразныя сродкі сцэнічнага мастацтва: драматургічная аснова – сцэнарый, рэжысёрская задума, артыст, выканаўца, сцэнаграфія, музычна-шумавое вырашэнне, пластыка, танец, відэа і фота, паэзія, вусна-народная творчасць, песня, мантаж, тэмпа-рытм, мізансцэны і іншае. Алегорыя, метафара, сімвал.

## Тэма 12. Драматургія традыцыйнага абраду

Вызначэнне тэмы і задач абраду. Аналіз сюжэта і характараў дзеянняў. Падзейны рад і значэнне абраду. Скразное дзеянне і скразное контрдзеянне. Падзея і прапанаваныя абставіны. Драматычная сітуацыя і альтэрнатыўны фактар. Драматычныя перыпетыі і катарсіс. Развіццё драматычнай сітуацыі ў канфлікце. Пошук і разуменне сцэнічнай формы і адпаведнага вобраза абрадавай дзеі – сінтэзу пластычнага, мастацка-дэкаратыўнага і музычнага ўвасаблення.

## Тэма 13. Драматургія шэсцяў народных свят

Паняцце тэрміна «шэсце». Класіфікацыя шэсцяў народных свят па форме і змесце. Драматургія шэсця у прыкладах і задачах. Паняцце «карты» свята і структуры шэсця. Вызначэнне звышзадачы шэсця і адпаведнасць яе святу. Распрацоўка тэкставага складніку шэсця. Сімволіка шэсця. Касцюмы і

рэквізіт удзельнікаў шэсця. Драматургічны аналіз шэсцяў у сучаснай народнай святочнай культуры.

### Тэма 14. Сцэнарная распрацоўка эпізода свята на аснове фальклорнага, музычнага, выяўленчага, вуснапаэтычнага матэрыялу

Эпізод як самастойная форма сцэнічнага дзеяння. Віды эпізодаў свята і іх асаблівасці. Патрабаванні да стварэння эпізода свята. Хранаметраж. Структура. Распрацоўка эпізода на аснове (песні, музычнага твора, паэтычнага твора, вуснага-народнай творчасці, анімацыі, дакументальнага матэрыялу). Выяўленне канфлікту ў эпізодзе. Самабытнасць эпізода.

### Тэма 15. Рэканструкцыя, рэстаўрацыя, трансфармацыя народных абрадаў і свят

Паняцці «рэканструкцыя», «рэстаўрацыя», «трансфармацыя». Прыклады і аналіз розных падыходаў да стварэння абрадаў і свят. Выбар спосабаў пастаноўкі абрадаў і свят. Асноўныя этапы работы над рэканструкцыяй народнага абраду, свята. Асноўныя этапы работы над рэстаўрацыяй народнага абраду, свята. Асноўныя этапы работы над трансфармацыяй народнага абраду, свята.

### Тэма 16. Методыка стварэння літаратурнага сцэнарыя трыдыцыйнага абраду

Вызначэнне ідэйна-тэматычнай накіраванасці традыцыйнага каляндарнага ці сямейна-бытавога абраду. Стылізацыя народнага абраду. Распрацоўка сцэнарыя народнага абраду на аснове глыбокага вывучэння агульнанацыянальных, рэгіянальных і мясцовых традыцый яго ўвасаблення. Характарыстыка паняццяў сцэнарны план, літаратурны сцэнарый, мантажны ліст у кантэксце асноўных этапаў работы над сцэнарыем. Вызначэнне канструктыўных элементаў як важнейшы этап творчай дзейнасці сцэнарыста.

### Тэма 17. Методыка стварэння літаратурнага сцэнарыя народнага свята

Вызначэнне ідэйна-тэматычнай накіраванасці народнага свята. Стылізацыя народнага свята. Распрацоўка сцэнарыя народнага свята на аснове глыбокага вывучэння агульнанацыянальных, рэгіянальных і мясцовых традыцый яго ўвасаблення. Характарыстыка паняццяў сцэнарны план, літаратурны сцэнарый, мантажны ліст у кантэксце асноўных этапаў работы над сцэнарыем. Вызначэнне канструктыўных элементаў як важнейшы этап творчай дзейнасці сцэнарыста над увасабленнем народнага свята.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Форма контролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | Індывідуальныя заняткі | |
| 1. | Уводзіны. Прадмет і задачы курса. Роля народных абрадаў і свят у жыцці дзяржавы і грамадства | 4 | | | |
| 2. | Класіфікацыя народных свят і іх характэрныя асаблівасці | 2 | | | |
| 3. | Звычаі, абрады, рытуалы ў народнай традыцыі | 2 | | | |
| 4. | Паняцце «драматургія» і яго асноўныя кампаненты | 2 | | | |
| 5. | Паняцці драматургіі: фабула, сюжэт, сінапсіс, іх функцыянальнасць | 2 | 4 | | |
| 6. | Спецыфіка драматургіі народных абрадаў і свят | | 6 | | вуснае апытанне |
| 7. | Рэжысёрская задума ў працы над сцэнарыям народнага свята, абраду | | 6 | | |
| 8. | Кампазіцыйныя элементы сцэнарыя і законы кампазіцыі | | 6 | | |
| 9. | Канфлікт у драматургіі народнага свята. Скразное дзеянене і супрацьдзеянне | | 6 | | |
| 10. | Мастацкі вобраз народнага свята | | 6 | | дзеннік назірання |
| 11. | Выразныя сродкі народнага свята, абраду | | 6 | | вуснае апытанне |
| 12. | Драматургія традыцыйнага абраду | | 6 | | дзе |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | ннік назірання |
| 13. | Драматургія шэсцяў народных свят | | 6 | | дзеннік назірання |
| 14. | Сцэнарная распрацоўка эпізода свята на аснове фальклорнага, музычнага, выяўленчага, вуснапаэтычнага матэрыялу | | 6 | 4 | |
| 15. | Рэканструкцыя, рэстаўрацыя, трансфармацыя народных абрадаў і свят | | 6 | | |
| 16. | Методыка стварэння літаратурнага сцэнарыя трыдыцыйнага абраду | | 8 | 4 | |
| 17. | Методыка стварэння літаратурнага сцэнарыя народнага свята | | 8 | 4 | напісанне сцэнарыя |
| | **Усяго** | **12** | **80** | **12** | залік; экзамен |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная:*

1. Валодзіна Т. В. «Ядраное жыта гаспадара кліча…»: каляндарны год у абрадах і звычаях / Т.В. Валодзіна, Т. І. Кухаронак. – Мінск : Беларус. навука, 2015. – 356 с.

2. Гуд, П. А. Беларускае Купалле: кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей / П. А. Гуд. – Мінск: БДУ культуры, 1999. – 137 с.

3. Камінскі, А. Я. Асновы драматургіі і сцэнарнага майстэрства / А. Я. Камінскі. – Мінск : БДУКМ, 2011. – 112 с.

4. Мойсейчук, С. Б. Режиссура культурно-досуговых программ / С. Б. Мойсейчук. – Минск : БГУКИ, 2011. – 99 с.

5. Кухаронак Т. І. Святочны час: Народныя звычаі і павер'і ў аповедах беларусаў / Т. І. Кухаронак; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы. – 2-е выд. – Мінск: Беларуская навука, 2025. – 311 с.

*Дополнительная:*

1. Аль, Д. Н. Основы драматургии / Д. Н. Аль. – СПб.: СПбГУКИ, 2005. – 280 с.

2. Генкин, Д. М. Сценарное мастерство культпросветработника / Д. М. Генкин, А. А. Конович. – М.: Сов. Россия, 1984. – 136 с.

3. Гуд, П. А. Беларускі кірмаш / П. А. Гуд, Н. І. Гуд. – Мінск: Полымя, 1996. – 270 с.

4. Гуд, П. А. Драматургія і рэжысура гульнёва-забаўляльных праграм у народным свяце / П. А. Гуд // Аматарская творчасць: устойлівыя і новыя тэндэнцыі: матэрыялы рэсп. навук.-практ. канф. (22–23 кастр. 1998 г.) / БелІПК. – Мінск, 1999. – С. 130–133.

5. Гуд, П. А. Святы, якія заўжды з намі: гульнявыя праграмы «Ад Каляд да Пакроваў» / П. А. Гуд. – Мінск: Красіка-Прынт, 2000. – 224 с.

6. Камінскі, А. Я. Рэжысура традыцыйнага абраду / А. Я. Камінскі. – Мінск : БДУКМ, 2009. – 113 с.

7. Черняк, Ю. М. Режиссура праздников и зрелищ / Ю. М. Черняк. – Минск : Тетра Системс, 2004. – 224 с.

## Рэкамендаваныя метады навучання

Інструментарый выкладчыка дысцыпліны, які спрыяе фарміраванню кампетэнцый, выкарыстоўвае такія педагагічныя метады навучання, як:

– метады вуснага выкладання матэрыялу і актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці студэнтаў (апавяданне, тлумачэнне, лекцыя, гутарка);

– метады самастойнай работы студэнтаў па асэнсаванні і засваенні новага матэрыялу: праца з літаратурай, практычныя заняткі;

– гульнявы метад (у народных гульнях);

– візуальныя метады (ілюстрацыі, дэманстрацыя, відэаматэрыялы).

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананню самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў накіравана на ўзбагачэнне іх ведаў, уменняў і навыкаў па вучэбнай дысцыпліне «Драматургія народных абрадаў і свят». Мэта самастойнай работы студэнтаў-садзейнічанне засваенню ў поўным аб’ёме зместу вучэбнай дысцыпліны праз сістэматызацыю, планаванне і кантроль.

Самастойная работа студэнтаў па тэмах вучэбнай дысцыпліны ажыццяўляецца ў форме прагляду і рэжысёрскага аналізу разнастайных народных абрадаў і свят.

## Пералік рэкамендуемых сродкаў дыягностыкі

Для кантролю за засваеннем студэнтамі вучэбнага матэрыялу выкарыстоўваюцца метады вусной дыягностыкі ведаў (апытанне, даклад); метады практычнай дыягностыкі (напісанне сцэнарных планаў, сцэнарыяў і рэжысёрскіх задум, пастаноўка нумароў і эпізодаў).

Дыягностыка кампетэнцый студэнтаў ажыццяўляецца з дапамогай:

– праверкі дзённікаў назіранняў;

– вуснага апытання студэнтаў;

– праверкі сцэнарнага плана, складзенага студэнтам;

– ацэнкі сцэнарыя народнага свята напісанага студэнтам.

Для выніковай дыягностыкі ўзроўню ведаў, уменняў і навыкаў студэнтаў, атрыманых у працэсе вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Драматургія народных абрадаў і свят», праводзяцца экзамен або залік.